ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
6 12 2018 г.

SEX=БАЛЯСЫ

ПРАДАЖНАЕ ЖЫЦЦЁ

Ніколі не разумеў людзей, якія любяць, як той казаў, пыл у вочы пускаць. Жыве, скажам, чалавек у маласямейцы, але замест таго, каб найперш палепшыць свае жыллёвыя ўмовы, набывае машыну. («Мужыкі, не пазычайце ў мяне ў найбліжэйшы час. Я аплаціў камуналку і апусціўся на некалькі радкоў у спісе Forbes».) Ці вось ідзе па вуліцы ў цэнтры горада перад табой дама ў шыкоўным футры... Ведаеце, такая ўся з сябе... («Нішто так не ўзбуджае дзяўчыну, як лёгкае пакусванне колішнімі сваіх локцяў».) Я абсалютна не супраць таго, каб жанчына выглядала прыгожа, нават наадварот. Гаворка ж пра іншае. Проста, магчыма, гэта адзінае, што ў яе ёсць каштоўнага. («— Усе свае збяражэнні трачу на падарожжы. — Зноў маршрутка падаражэла? — Так».) Выклікаўшы захопленыя позіркі мінакоў, яна потым дома павесіць тое футра, не выключана, у скасабочаную шафу ў вітальні з зашмальцаванымі шпалерамі. А што, ніхто ж не бачыць — у адрозненне ад дарагой норкі...

Гэта не ўчора павялося. Прыгадайце, што стала прычынай прызначэння дуэлі паміж д'Артаньянам і Партосам? Першы выпадкова раскрыў таямніцу мушкецёрскай перавязі другога: шыкоўнай яна была толькі спераду. І не заўсёды датычылася матэрыяльнага. Памятаеце палюбоўніцу кінарэжысёра Якіна з кінакамедыі «Іван Васільевіч мяняе прафесію» з яе знакамітай фразай: «Ало! Галачка? Ты зараз памрэш, ашаламляльная навіна! Якін кінуў сваю кікімару, ну, і ўгаварыў мяне ляцець з ім у Гагры!»

Як бы там ні было, але і машына, і футра, і перавязь для шпагі, і нават халяўная паездка на курорт — рэчы практычныя. На аўтамабілі можна ездзіць, а ў норцы зімой будзе цёпла. Можа, і дарагавата, але ж і карысць ёсць. («Хочацца нечага асаблівага, накшталт пацалунка ці бутэрброда з каўбасой»). Але ўсё змянілася, калі з'явіліся яны — людзі, гатовыя плаціць немалыя грошы толькі за тое, каб любой цаной зрабіць уражанне ў сеціве. («Што можа быць горш за разбітае сэрца? Калі прачнуўся ранкам і зразумеў, што дрэнна ўваткнуў адаптар у разетку і тэлефон ноччу не зарадзіўся».) Дзякуючы ім з цягам часу працэс пускання пылу ў вочы стаў добра адладжанай індустрыяй. Як для тых, хто хоча падавацца ў вачах іншых лепшым (больш паспяховым, багатым, прыгожым, таленавітым), чым ёсць насамрэч, так і тых, хто забяспечвае ўвесь патрэбны антураж. («Мала хто ведае, што сабака Андрэя Данілкі ў звычайным жыцці — кот».)

Яшчэ нядаўна як было? Прыйшоў у кавярню — выкладзі ў «Інстаграме» здымкі страў: што еў, што піў. («Асцерагайцеся тых, хто не фатаграфуе ежу. Гэта страшныя непрадказальныя асобы, якія прыходзяць у рэстаран тупа пажэрці!») Трапіў у спартыўную залу — не лянуйся, зноў фатаграфуйся! («— Добры дзень, хачу запісацца на фітнес. — Абяцанне з нагоды Новага года? — Так. — У нас ёсць аднадзённы курс з чатырма сэлфі».) З'ездзіў да бабулі ў вёску пагасцяваць? Можа, бульбу дапамог выбраць? Кідай справаздачу на фоне сельскай пастаралі! («Вельмі балюча адкрываць «Інстаграм». Калі ласка, перастаньце падарожнічаць».) А проста трэшаковы гламур? Навялі на цябе аб'ектыў — не губляйся, будзь напагатове, у сеціве ўсё спатрэбіцца. («Фотапараліч — усе раптоўныя перакосы плеч, нахілы галавы, выцягванне вуснаў, скрыўленне спіны і пастаноўка нагі на насок у момант, калі на дзяўчыну накіроўваюць камеру»). Ну, усё гэта хаця б грошай не каштавала.

Нядаўна ў расійскіх СМІ з'явіўся матэрыял, прасвечаны бізнесу «на пантах». Аказваецца, каб зрабіць эфектны здымак, спецыяльна за грошы арандуюцца лімузіны, прыватныя самалёты, экзатычныя жывёлы (хоць кракадзіл), букеты ад «паклоннікаў». Усё дзеля таго, каб «прадаць» свой вобраз у сеціве. («— Ведаеце, як высветліць, што ў чалавека айфон? Ніяк! Ён сам вам раскажа пра гэта ў першыя пяць хвілін знаёмства. — Дарэмна вы так пра ўладальнікаў айфонаў... У мяне вось дзясяты, і я не хвалюся асабліва».) Арандаваць для «асабістага жыцця» ў «Інстаграме» можна нават мача. І наздымаць «каханага» на паўгода наперад. («Муж: — Усё! Цяпер займацца сексам буду толькі за грошы! На падлозе — рубель, у ложку — пяць, на прыродзе — дваццаць пяць! Жонка: — Ок! (Дастае з сумачкі дваццаць пяць рублёў.) — Муж: — Што, на прыродзе? Жонка: — На падлозе. На ўсе!») Некаторыя спрабуюць растлумачыць свае паводзіны спробай раскруціць бізнес у сеціве. Маўляў, будзе ў старонкі шмат падпісчыкаў, будзе і даход ад рэкламы. Але спецыялісты ў гэтай сферы кажуць, што гэта ўжо не вельмі працуе. («Як зарабіць пры дапамозе інтэрнэту ўсяго ў два крокі. 1. Адключаем інтэрнэт. 2. Ідзём працаваць».) Таму феномен з'явы крыецца хутчэй у вышэйназваных пантах і элементарнай залежнасці ад сацыяльных сетак, тлумачаць расійскія псіхолагі. («Адна дзяўчынка не паставіла нагу на насок падчас фатаграфавання, і на здымку атрымалася помесь тумбы і каровы, усё ў тлушчы... Сяброўкі спыняюць стасункі, у «Інстаграме» баняць, мадэльныя агенцтвы рвуць яшчэ не падпісаныя кантракты, мужыкі ў жаху разбягаюцца, назаўсёды губляючы патэнцыю... З таго часу дзяўчаты баяцца не ставіць нагу на насок»).

...Маралізатарствацьваць не буду, скончу анекдотам. «Дзяўчаты, якія працуюць у дарагіх буціках і заўсёды глядзяць на людзей зверху, супакойцеся! Вы ўсяго толькі прадаўцы».

Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.

«ЧЫСТАЯ ЛІТАРАТУРА» НАЎРАД ЦІ ПРАКОРМІЦЬ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

* * *

Бывае, што асноўная праца замінае літаратурнай дзейнасці. І даволі часта. На буйныя формы патрэбны час, з наскоку такое не робіцца, трэба пасядзець, падумаць. Выбудаваць сюжэт. Схемку персанажаў накідаць, стрэлачкамі намаляваць іх стасункі, мінімальныя характарыстыкі даць. Такі падрыхтоўчы этап. Гэта, напэўна, спецыфіка працы менавіта сцэнарыста: пакуль не размалюеш для сябе «сетку», не можаш рухацца далей.

Гэтыя прыёмы — набытак з універсітэцкіх часоў, з БДУКіМ, дзе я вучылася па спецыяльнасці «рэжысура абрадаў і свят». Атрымліваецца, я не проста рэжысёр, я, як кажуць, «пляцоўнік», рэжысёр-канцэртнік. Гэта, так бы мовіць, асобная каста. Каста людзей, якія працуюць з блокамі інфармацыі. Задача «наразаецца» перад рэжысёрамі блокаў, а потым, згодна з канцэпцыяй, усё зводзіцца ў адзін стройны сюжэт.

Дык вось, адну кнігу мне асабліва рэкамендаваў мой шаноўны куратар Аляксей Якаўлевіч Камінскі. Гэта была кніга Аляксандра Міты «Паміж пеклам і раем», дзе схематычна, сцісла, вельмі зразумела тлумачыцца, як правільна пішацца сцэнарый. І ўвогуле — як робіцца кіно. Усё карысна і ў літаратурнай, і ў канцэртнай маёй дзейнасці. Уласна, дзякуючы гэтай кнізе і дзякуючы высілкам Аляксея Якаўлевіча з мяне і атрымаўся рэжысёр, сцэнарыст. Аляксей Якаўлевіч, шчыра дзякую вам за ўсё.

* * *

Адносна працы з тэкстам у мяне так: дзесяць тысяч знакаў за чатыры гадзіны. Інакш кажучы, асноўнае бывае менавіта на падрыхтоўчым этапе. Потым, калі ўсё прапісана, можна механічна адпрацаваць гэта ў тэксце.

Ну а моўныя хібы хай паправіць рэдактар — на тое ён і рэдактар.

Сваю прыгодніцкую аповесць (якая нядаўна друкавалася ў часопісе «Маладосць») пад назваю «Зорка Ракхігархі» я пісала 26 дзён. Твор амаль не правіла: стараюся тыя кавалкі, якія раблю, у той жа дзень перачытаць і «падагнаць», супаставіць з іншымі.

Калі ёсць адладжаная схема тэксту, то, у прынцыпе, можна працаваць з любога боку, прапісваючы эпізоды не ў храналагічным парадку. Галоўнае — разумець, да чаго ў выніку ўсё хочаш прывесці. Мне зручней рабіць усё паслядоўна, бо так можна прасачыць, як артэфакты розныя ў тэксце з'яўляюцца, як змяняюцца персанажы. Бо часам, калі працуеш спачатку над эпізодамі канцоўкі, цяжкавата гэтыя змены адсачыць.

Зручней за ўсё мне пісаць у ложку. Прачынаюся раніцай — і працую з ноўтбукам. Самы прадукцыйны перыяд — недзе з васьмі гадзін да трынаццаці. Я не тое каб жаўранак, проста важная свежая галава, не забітая турботамі, клопатамі і навінамі. Ёсць нейкі «ліміт знакаў» на дзень. Выпішаш гэты ліміт у сацсетках — і на тэкст нічога не застанецца.

* * *

«Фэйсбук» у мяне ёсць. Дакладней, і раней быў, проста я на пэўны час ад яго адмовілася, але потым вярнулася. Там жа коцікі!

Ну і таксама праз гэтую сацсетку падтрымліваю творчыя, літаратурныя кантакты, адсочваю навіны, умоўна кажучы, «тусоўкі». Але калі прабіваць па пошукавіках, то мяне нібы і няма ў сеціве: мала крытыкі, мала водгукаў. Пішаш як бы ў Сусвет. Наткнецца нехта вачамі — ну і добра. Таму я і не пазіцыяную сябе як пісьменніка, бо пісьменніцтва — гэта заўжды публічнасць, feed-back.

Таму, як ні крыўдна і горка, літаратура ў мяне на другім месцы. Заўжды трэба думаць, як зарабіць.

У сённяшнім свеце пісьменнікам быць няпроста. Шукаеш спосаб апублікавацца, выдаць кнігу. Так, зараз шукаю магчымасці, каб выдаць «Зорку Ракхігархі», працяг «Чамадана з кракадзілавай скуры» (які выйшаў кнігаю ў бібліятэчцы «Маладосці»). Можа, «Чамадан...» — яшчэ не зусім тое, што хацела б бачыць, але «Зорка...» — менавіта тое, што хацела сказаць.

Рукапіс кнігі фантастычных апавяданняў зараз знаходзіцца ў выдавецтве «Мастацкая літаратура»: спадзяюся, у 2019 годзе выйдзе мой томік у новай серыі «Час XXI». Гэта зборнік, сёе-тое мільгацела, публікавалася, але ёсць і тры зусім новыя тэксты. Хочацца і кніжку паэзіі выдаць у перспектыве, але пераглядала і зразумела: не ўсё праходзіць выпрабаванне часам. На вартую кнігу паэзіі не хапае матэрыялаў. Але сябе як паэта я «прасоўваю» праз прафесійную дзейнасць: пішу песні (зарэгістравана больш за 150), ладжу сумесныя імпрэзы з кампазітарамі.

Песні, да таго ж, кормяць. Акупляюцца. Асабліва калі гучаць пасля на радыё ці тэлебачанні. А вось «чыстая літаратура» наўрад ці пракорміць.

* * *

Кожнаму пісьменніку, на маю думку, патрэбны літаратурны агент. Калі сам пішаш і рэкламуеш сябе, сітуацыя з разраду «і танцую, і пяю, і білеты прадаю». Добра, калі дапамагае рэдакцыя, выдавецтва. Але часта бывае, што аўтар друкуецца, а прадаваць, прасоўваць яго творы нібыта і няма каму. І «звесці» з рэдакцыяй або выдавецтвам няма каму, хіба што сам надумае і звернецца. Атрымліваецца, аўтар сам сабой займаецца, сам сабе імідж стварае, а ўсе гэтыя «маркетынгавыя» пытанні адбіраюць вельмі многа часу ад творчасці.

Можа, варта звярнуць увагу на заходніх калег, дзе інстытут літаратурных агенцтваў ужо досыць даўно і дзейнічае.

* * *

Калі казаць пра мяне як пісьменніка на сённяшнім этапе развіцця, — то «я-сапраўдная», напэўна, у апавяданні «Белы дом». Папершае, гэта тэкст, да якога ў мяне няма прэтэнзій на моўным і сюжэтным узроўнях. Па-другое, мне імпануе жанр — антыўтопія. Увогуле, і не апавяданне гэта нават, а міні-аповесць на 33 тысячы знакаў. Наогул, антыўтопія і рамантычная фантастыка (не sci-fi) — гэта мне зараз найбольш блізка.

А «я-паэт», напэўна, найлепей праявілася ў паэме «Акіяны» (якую можна, як і «Зорку...», пабачыць на старонках «Маладосці» за гэты год). Можа, нават «я-чалавек» — гэта і ёсць тая паэма. Таму што яна — шчырая».

Чытацкая парада ад Алены Беланожкі: абавязкова пазнаёміцца з аповесцю «Цытадэль» Антуана Экзюперы. «Гэта квінтэсэнцыя жыццёвай мудрасці», — кажа яна.

Запісала Маргарыта ЛАТЫШКЕВІЧ.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.008.
Нумар падпісаны ў 19.30 05.12.2018 г.